Асвячэнне новага касцёла ў Гродне

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
09.01.2022 00:00



Парафія з 24-гадовай гісторыяй нарэшце мае свой кансэкраваны касцёл. 25 снежня, ва ўрачыстасць Божага Нараджэння, біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч асвяціў касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі Вастрабрамскай, Маці Міласэрнасці, у Гродне (Аўгустовак). †

Новая святыня ў стылі неабарока паўстала на месцы былога маёнтка Аўгустовак, які належаў апошняму каралю Рэчы Паспалітай Станіславу Аўгусту Панятоўскаму.

Парафія, якая мае тытул галоўнай апякункі Гродзенскай дыяцэзіі, была зарэгістравана дзяржаўнымі ўладамі 10 студзеня 1998 года.

На святой Імшы ў новым касцёле сабраліся шматлікія вернікі разам са сваім пробашчам кс. Аляксандрам Шэметам, госці парафіі і ахвяравальнікі. Падчас Эўхарыстыі асаблівая падзяка скіроўвалася Богу за дар гэтага касцёла, а таксама ўсім людзям добрай волі, якія прычыніліся да яго ўзвядзення.

Біскуп Аляксандр Кашкевіч падкрэсліў, што новая святыня яшчэ больш упрыгожыць горад над Нёманам, а таксама стане для мясцовых парафіян асаблівым месцам сустрэчы з Богам.

Асвячэнне новага касцёла ў Гродне

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
09.01.2022 00:00

